# Рэцэнзіі

**Беларусы. Т. 5. Сям'я** / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш. Мн.: Бел. навука, 2001. 375 с.: іл.

Кніга складаецца з уводзін, трох раздзелаў, заключэння і спіса ілюстрацый. Ва ўводзінах (аўтар – В.К. Бандарчык) абгрунтавана навуковае і практычнае значэнне даследавання, разгледжана гістарыяграфія, дадзена характарыстыка крыніц.

У першым раздзеле "Сямейны ўклад жыцця" (аўтар – Г.М. Курыловіч) аналізуецца дынаміка структуры сям'і, унутрысямейных адносін, матэрыяльнага забеспячэння, жыллёвых і санітарных умоў. Формы і тыпы сям'і вызначаны на аснове колькасці шлюбных пар і пакаленняў, а таксама сваяцтва. Традыцыйныя рысы ў найбольшай ступені захоўваліся ў нераздзельнай сям'і. Старэйшыя мужчыны карысталіся асаблівай павагай і аўтарытэтам у членаў сямейнага калектыву. Аб'ектыўна ахарактарызавана становішча жанчыны, паказана, што яно не было прыніжаным. Глыбока разгледжана гаспадарчая дзейнасць сям'і фермера, умовы працы, забеспячэнне тэхнікай, адзеннем, паказана разнастайнасць спосабаў вырабу прадуктаў харчавання, прыгатавання страў, грунтоўна прааналізаваны жыццёвыя і санітарна-гігіенічныя ўмовы беларускай сям'і.

Другі раздзел "Традыцыі выхавання" (аўтар – Л.В. Ракава) прысвечаны аналізу педагагічнай спадчыны беларускай сям'і. У ім дакладна вылучаны і ахарактарызаваны ўзроставыя групы, асаблівасці іх выхавання і добра паказана роля бацькоў у выхаванні дзяцей, прасочана фарміраванне належных адносін да працы як галоўнейшай сферы дзейнасці. У раздзеле разгледжана таксама традыцыйнае эстэтычнае выхаванне, працэс фарміравання асобы, якая любіць прыгажосць. Раскрыта сутнасць рэлігійнага выхавання дзяцей, засваенне імі народнай маралі, падрабязна прааналізаваны формы і спосабы народнага сямейнага выхавання. Адзначана, што самым важным спосабам выхавання дзяцей з'яўляецца іх удзел у гаспадарчых работах, у святах, абрадах, занятках музыкай і іншымі відамі мастацтва. Паказана вялікая роля роднай мовы, фальклору.

У трэцім раздзеле "Сямейныя абрады" (аўтар – Т.І. Кухаронак) разгледжана вясельная, радзінная і пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў. Эфектыўна выкарыстаны структурна-генетычны метад, які даў магчымасць вывучыць кожную з'яву з часу яе ўзнікнення і да сённяшняга дня, ахарактарызаваць працэсы яе трансфармацыі і эвалюцыі, вызначыць асноўныя структурныя элементы і асаблівасці бытавання сямейнай абраднасці беларусаў у мінулы і сучасны перыяд. У ім добра паказана самабытнасць, багацце беларускага традыцыйнага вяселля, паслядоўна прааналізаваны асноўныя яго этапы – сватанне, заручыны, дзявоцкі вечар, каравайны абрад і інш. Аб'ектыўна ацэнены сучасны стан вясельнай абраднасці, усебакова апісана радзінная абраднасць беларусаў. Навукова растлумачаны ўяўленні, павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, родамі, абрадавыя дзеянні, што суправаджалі першы крок дзіцяці, першае слова. Падрабязна ахарактарызаваны хрэсьбіны, разнастайныя магічныя дзеянні, радзінныя абрадавыя песні і замовы-пажаданні. Усебакова даследавана ў раздзеле пахавальна-памінальная абраднасць, яе фарміраванне, паступовае развіццё, значэнне ў традыцыйнай культуры беларусаў.

У заключэнні (аўтар – М.Ф. Піліпенка) сфармуляваны вывады даследавання, указаны асноўныя заканамернасці развіцця сям'і беларусаў. У рэцэнзіруемай працы змешчана звыш сямідзесяці фотаздымкаў, якія даюць наглядные ўяўленне пра яе змест. Неабходна адзначыць, што ў дадзенай кнізе ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак вялікі фактычны матэрыял пра беларускую сям'ю, сабраны аўтарамі ў час шматлікіх этнаграфічных экспедыцый ва ўсе рэгіёны Беларусі.

Разам з тым у кнізе зусім не разгледжана гарадская сям'я, сям'я прывілеяваных саслоўяў (мяшчан, шляхты, духавенства і г. д.), неналежным чынам прасочана гісторыя сям'і на Беларусі. Таму хочацца пажадаць, каб гэтыя аспекты сталі прадметам далейшага вывучэння.

Том "Сям'я" з'яўляецца грунтоўным этналагічным даследаваннем сям'і беларускага этнасу, яе ўкладу жыцця, традыцый выхавання, абрадаў. Гэтая навуковая праца неабходна не толькі спецыялістам, але і шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца традыцыйнай культурай беларускага народа.

***Т.А. Навагродскі,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm